Усходні гараскоп на наступны тыдзень

АВЕН. Тыдзень у цэлым будзе спакойны і паспяховы, але залішне таксама расслабляцца не варта. Навакольныя будуць падтрымліваць, сябры створаць кампанію, толькі рабіце што-небудзь важнае і патрэбнае. Не будзьце пасіўныя: лежачы на канапе, вы нічога не будзеце мець, у той час як актыўнасць прынясе сапраўдны поспех. Праца стане выдатным рэцэптам ад дрэннага настрою не толькі для вас, але таксама і для тых, каго вы зможаце ўгаварыць да вас далучыцца.

ЦЯЛЕЦ. На гэтым тыдні спатрэбяцца разважлівасць і стрыманасць: толькі гэтыя якасці змогуць хоць неяк змякчыць вашу імпульсіўнасць. Выход сітуацыі, якая склалася на рабоце, будзе залежаць толькі ад вас. У першай палове тыдня спрыяльныя паездкі, дзелавыя візіты і паходы ў госці. Пятніца можа аказацца самым складаным днём тыдня: вас могуць выпрабоўваць на трываласць. У суботу магчыма шчырая размова.

БЛІЗНЯТЫ. Вы можаце горы звярнуць і ажыццявіць свае самыя смелыя мары. Пабольш упэўненасці ў сабе! Выкарыстоўваючы абаянне і дыпламатычныя здольнасці, можаце дасягнуць мэты і атрымаць значны прыбытак. У разгары галавакружны раман, які прынясе масу радасці і пазітыўныя змены ў жыцці. Жаданні ажыццявяцца нейкім дэманстратыўна цудоўным чынам. Ваша задача — захацець, астатняе дадасца.

РАК. Тыдзень абяцае шмат добрага і пазітыўнага, аднак гэта трэба ўмець заўважыць. Праяўляйце ініцыятыву ў прафесійных справах, не чакайце, пакуль усё самае складанае дастанецца іншым. У чацвер рэкамендуецца быць напагатове. Магчыма, паступіць прапанова новай работы, вельмі перспектыўная. У асабістым жыцці ўсё добра. Гэта для вас ціхая гавань.

ЛЕЎ. Залішняя разважлівасць робіць вас занадта асцярожным чалавекам, перашкаджае чымсьці захапіцца і нарабіць выдатных глупстваў. Магчыма, варта аслабіць кантроль? Будзьце гатовыя ўдзельнічаць у вырашэнні чужых праблем, калі, вядома, гаспадары праблем не будуць занадта актыўна пярэчыць. Надыходзіць спрыяльны час для самаўдасканалення і раскрыцця новых здольнасцяў. У канцы тыдня пажадана скараціць работу да разумнага мінімуму і не пачынаць нічога новага.

ДЗЕВА. Магчымыя карысныя і канструктыўныя сустрэчы са старымі партнёрамі па бізнесе і сябрамі. На работу, хутчэй за ўсё, вы будзеце прыходзіць у прыўзнятым настроі і з добрым запасам сіл. Сярэдзіна тыдня запоўніцца прыемнай мітуснёй і клопатамі. Ад вашага эмацыянальнага стану і настрою будзе залежаць настрой блізкіх людзей. Выхадныя лепш за ўсё правесці за горадам.

ШАЛІ. На гэтым тыдні на ваш светапогляд можа сур'ёзна паўплываць фінансавы аспект, магчымасць годна зарабляць і прымаць рашэнні аб расходах самастойна. Аўторак — удалы дзень для пачатку новага праекта або змены работы. У пятніцу не імкніцеся асягнуць неабсяжнае, бо жаданне перарабіць адначасова вялікую колькасць спраў можа прывесці да ператамлення і нервовых зрываў. Субота — добры час для зносін з сябрамі.

СКАРПІЁН. На гэтым тыдні добры настрой і душэўны ўздым дазволяць хутка і лёгка вырашаць складаныя прафесійныя пытанні. Удача будзе асабліва добразычлівая да юрыстаў і праваабаронцаў. Чакайце салідны прыбытак. Ваш аўтарытэт будзе расці, павольна, але безупынна. Выхадныя для адчування паўнаты жыцця правядзіце з каханым чалавекам.

СТРАЛЕЦ. Пажадана не спыняцца на дасягнутым. Калі будзеце празмерна клапаціцца аб ментальным камфорце і дабрабыце, то можаце прынесці ў ахвяру рэалізацыю вельмі цікавых і перспектыўных планаў. У чацвер лепш не ўступаць у спрэчкі з начальствам. У пятніцу ад вашых добрых узаемаадносін з калегамі будзе многае залежаць.

КАЗЯРОГ. На гэтым тыдні можна ўздыхнуць з палёгкай, усё ўстае на свае месцы, і справы, падобна, наладжваюцца. Прымайце прапановы калег і сяброў, гэта зможа змяніць ваша жыццё. У чацвер трэба стрымліваць эмоцыі і не даваць волі гневу і раздражненню. У пятніцу пажадана не ўблытвацца ў авантурныя або сумніўныя гісторыі. Субота — удалы дзень для паездак, падарожжаў, як блізкіх, так і далёкіх.

ВАДАЛІЎ. Тыдзень абяцае быць дастаткова актыўны і напружаны. Затое пры жаданні, скарыстаўшыся абставінамі, будзе шанц многага дасягнуць. Вам спатрэбяцца такія якасці, як дыпламатычнасць і ўменне аналізаваць учынкі іншых. Выяўляйце настойлівасць пры адстойванні сваіх інтарэсаў, асабліва ў сераду. Рабочая абстаноўка абяцае быць спакойнай, што дазволіць вам злёгку расслабіцца. Не ўзвальвайце на свае плечы залішні груз, надарвяцеся.

РЫБЫ. На гэтым тыдні на першы план могуць выйсці асабістыя справы, пытанні, звязаныя з сям'ёй, пагражаюць заняць увесь час і думкі. Магчыма, будзе шмат мітусні, турбот, складанасцяў у прыняцці канкрэтных рашэнняў. Не настойвайце на сваім, пачуйце довады іншых. У дзелавой сферы спрыяльныя новыя доўгатэрміновыя праекты. Пашырэнне круга знаёмстваў прынясе новыя магчымасці, але ўсё ж такі больш праблем і неразбярыхі. У вас ёсць шанц завесці навакольных сваімі ідэямі і знайсці падтрымку.

Даты | Падзеі | Людзі

6 ЧЭРВЕНЯ

У краіне

1895 год — нарадзіўся Сямён Іванавіч Нядзвігін, удзельнік баёў супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, генерал-маёр.

1910 год — нарадзіўся Антон Канстанцінавіч Антановіч, беларускі мовазнавец, доктар філалагічных навук. Выявіў 24 рукапісныя кнігі XVII — пачатку XX стагоддзя на беларускай мове арабскім пісьмом.

1945 год — створаны Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна.

1950 год — нарадзіўся Аляксей Ануфрыевіч Дудараў, беларускі драматург, тэатральны дзеяч, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1991). Па яго сцэнарыях пастаўлены кароткаметражныя і мастацкія фільмы «Суседзі», «Белыя росы». Аўтар п'ес «Вечар», «Радавыя», «Чорная панна Нясвіжа», «У прыцемках» і іншых. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (двойчы), Дзяржаўнай прэміі СССР, прэміі «За духоўнае адраджэнне».

У свеце

1875 год — нарадзіўся Томас Ман, нямецкі пісьменнік, класік сусветнай літаратуры XX стагоддзя. Аўтар раманаў «Чароўная гара», «Доктар Фаустус» і іншых. Лаўрэат Нобелеўскай прэміі па літаратуры.

1895 год — нарадзіўся Мікалай Аляксандравіч Шчорс, легендарны ваеначальнік часоў Грамадзянскай вайны. Імем Шчорса названы вуліцы ў многіх гарадах нашай краіны. У гады Вялікай Айчыннай вайны яго імя было прысвоена тром партызанскім брыгадам і 16 партызанскім атрадам, якія дзейнічалі на акупаванай тэрыторыі Беларусі.

1905 год — нарадзіўся Міхаіл Фёдаравіч Шастакоўскі, расійскі вучоны-хімік, член-карэспандэнт АН СССР. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.

1945 год — указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР заснаваны медаль «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.».

1985 год — у СССР ажыццёўлены палёт касмічнага карабля «Саюз Т-13», пілатуемага экіпажам у складзе камандзіра карабля, двойчы Героя Савецкага Саюза лётчыка-касманаўта Уладзіміра Джанібекава і бортінжынера, Героя Савецкага Саюза Віктара Савіных. У ходзе палёту 8 чэрвеня ажыццёўлена стыкоўка касмічнага карабля з арбітальнай станцыяй «Салют-7». 2 жніўня ўпершыню ў свеце выканана стыкоўка з непрацуючай арбітальнай станцыяй і ажыццёўлены мантаж ва ўмовах адкрытага космасу буйнагабарытных канструкцый.

Так гаварыў...

БЕХЦЕРАЎ:
«Калі хвораму пасля размовы з доктарам не становіцца лягчэй, то гэта не доктар».

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.40	21.37	16.57
Віцебск —	4.22	21.35	17.13
Магілёў —	4.30	21.27	16.57
Гомель —	4.36	21.14	16.38
Гродна —	4.57	21.50	16.53
Брэст —	5.07	21.42	16.35

Месяц

Поўня 5 чэрвеня.
Месяц у сузор'і Казярога.

Імяніны

Пр. *Івана, Мікіты, Сцяпана, Сямёна, Фёдара.*
К. *Марыі, Паўліны, Лаўрэнція, Нікіфара, Сымона.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

— Вы такі прыгажун, і яшчэ не жанаты?

— Такое маё шчасце! Кожны раз, калі я сустракаю дзяўчыну, якая гатуе як мая мама, яна выглядае як мой тата.

У кожнай жанчыны ў шафе ёсць аддзел «А раптам я пахудзею?»

— Каханая! А чаму катлеты рознага памеру?

— Ну ты ж сам хацеў разнастайнасці ў ежы!

Надпіс на асфальце «Я люблю тваю жонку» ўзрушыў увесь дом...

Коратка пра сябе... На аматара.

Самая разумная расліна ў свеце — гэта хрэн. Ён усё ведае.

Праўду варта падаваць так, як падаюць паліто, а не кідаць у твар, як мокры ручнік.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс);
аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 287 18 81.

прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1840.
Нумар падпісаны ў 19.30 5 чэрвеня 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12